# Школьная планета

НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 8 (38) КРАСАВІК 2017

Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно”Мінскай вобласці



Пад вечар пацеркі густыя
з краплёў пасыпаў красавік.
Ты чутка слухаеш, прынік,
як звоняць перлы вадзяныя.
У іх ззяе захад і усход,



зор шафіровае праменне,
яны прапаляць да карэння
празрысты, тонкі, сіні лёд.
Спадаюць каплі цяжка, роўна.
І неяк сумна аднаму,
і сам не ведаеш, чаму
не можаш слухаць іх спакойна,



глядзець, як зорная рака
далёкі небасхіл калыша...
І новай моладасці пішаш
Усю ноч пад звон красавіка.

Максім Танк

Фота
Ірыны
Маркевіч






**КРАСАВІК**. *Паходзіць ад слова “красавацъ”, бо ў ім з’яўляюцца першыя краскі-кветкі. Гэтаму адпавядае і другое найменне, што сустракаецца ў старажытнай літаратуры,— “кветень”. У прыватнасці яго ўжывае Ф. Скарына ў “Малой падарожнай кніжыцы”. Такая ж форма захавалася ва ўкраінскай мове — “квітень” і польскай — “kwiecień”. У старажытных славян чацвёрты месяц яшчэ вядомы як “беразоль”.*



*Рускі “апрель” (таксама ў англічан, французаў, немцаў) паходзіць ад рымскага “аргііз”, што азначае “адчыняць”. У гэты месяц у Італіі адчыняліся дзверы вясны, распускаліся на дрэвах пупышкі.*




*Любоў да мовы, роднага краю, бацькаўшчыны прыходзіць праз веданне літаратуры, гісторыі, культуры, побыту мясцовасці. Цікавасць да мінулага, да сваіх каранёў, да сваёй спадчыны выклікае неабходнасць данесці яе да нашчадкаў.*

*У 2017 годзе адзначаецца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. Вывучэнне спадчыны Францыска Скарыны пачалося ў канцы XVIII ст.*

*Захавалася звыш 300 экзэмпляраў Скарынавых выданняў і іх фрагментаў, якія зберагаюцца ў розных бібліятэках, архівах і музеях свету, найбольш у Санкт-Пецярбургу і Маскве.*



*Спадчына Скарыны мае ўсеславянскае і ўсееўрапейскае значэнне. Яго мудрыя думкі і глыбокія ідэі актуальныя і сёння.*

*Пакуль людзі цікавяцца гісторыяй, памяць пра продкаў жыве і перадаецца з пакалення ў пакаленне.*

***Старонку падрыхтавала***
***Паліна Сямашка***

# Напамін аб вайне

Падчас падарожжаў па роднай Беларусі, дзе б мы не апынуліся, заўсёды можна ўбачыць помнікі, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. У кожнай вобласці мы сустракалі гэтыя помнікі: Мінская вобласць (Хатынь, Курган Славы; Бярэзінскі раён – вёскі Міраслаўка, Партызанка, Баравіно, Чырвонае), Брэсцкая вобласць (Колдычава), Гродзенская вобласць (Карэлічы), Віцебская вобласць (Шунеўка), Магілёўская вобласць (Бабруйск). Вайна не абмінула ніводзін куточак Беларусі.










Усе помнікі, якія мы наведалі, былі дагледжанымі, а гэта кажа аб тым, што людзі памятаюць, а раз памятаюць, то такі жах больш ніколі не паўтарыцца.

У Вялікую Айчынную вайну з канца чэрвеня 1941 года да ліпеня 1944 года вёска Колдычава была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія вясной 1942 года зрабілі тут лагер смерці для масавага знішчэння людзей. У лагеры было знішчана звыш 22 тысяч людзей, сярод якіх спачатку былі ваеннапалонныя, затым яўрэі і не толькі. У 1964 годзе на месцы размяшчэння лагера быў усталяваны помнік.




Шунеўка (мемарыяльны комплекс «Праклён фашызму») — мемарыяльны комплекс на месцы вёскі Шунеўка ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці, дзе 22 мая 1943 года нямецкія акупанты спалілі мясцовых жыхароў — старых, жанчын і дзяцей.




*Марыя Власюк,*
*фота аўтара*

# Галасы закаханых у беларускае слова




21 лютага, у Міжнародны дзень роднай мовы, быў дадзены старт *рэспубліканскаму конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка"*, удзел у якім прымаюць навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Конкурс праводзіцца дзеля таго, каб дзеці з задавальненнем чыталі творы класічнай беларускай літаратуры – і вершы, і прозу. Тым больш, *у 2017 годзе наша краіна адзначае 500-годдзе беларускага кнігадрукавання*, гэта той год, калі мы будзем удзяляць больш увагі прапагандзе кнігі і чытання. Невыпадкова рэспубліканскі творчы *конкурс "Жывая класіка" праводзіцца пад дэвізам "Чытаем шмат, чытаем разам, ствараем сябе і краіну!".*



У конкурса шырокая геаграфія. 22 красавіка прайшоў школьны этап, 29 красавіка – раённы. А 26 мая Міхалёў Уладзімір, вучань 3 "Б" класа прыме удзел у абласным этапе конкурсу. Вынікі "Жывой класікі" будуць падведзены ў *Дзень беларускага пісьменства ў горадзе Полацку.*




Ад усёй душы жадаем поспехаў усім юным чытальнікам.

***Лізавета Вайцяховіч,***
***фота Ірыны Маркевіч***








2017 год у Беларусі праходзіць пад знакам 135-гадовага юбілею вялікіх песняроў беларускага народа, класікаў нацыянальнай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Якуб Колас і Янка Купала – выразнікі нацыянальнай самасвядомасці, народных пачуццяў. У сваіх творах яны раскрылі нацыянальны характар, асаблівасці духоўнага складу і жыцця беларусаў, выявілі незвычайную сілу і творчую магутнасць беларускага слова.

Гістарычная заслуга Янкі Купалы і Якуба Коласа заключаецца перш за ўсё ў тым, што яны стварылі сапраўдныя шэдэўры нацыянальнага мастацтва і тым самым узнялі беларускую літаратуру да ўзроўню перадавых літаратур свету.





Купала і Колас, вы нас гадавалі!..
Мы з вамі выходзілі заўжды ў дарогу
А як акрыляла нас ваша слова,
Што сказана простаю матчынай мовай!
Мы з вамі адолелі буры і хвалі…
Купала і Колас, вы нас гадавалі…




***Выступленне супрацоўніка***
***Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы***

# Патрыятычныя падарожжы






















# У чым пайсці на выпускны вечар – 2017?



***Выпускны вечар*** — адна з самых значных падзей у жыцці кожнага вучня. Бо дзяцінства застаецца за дзвярыма школы, а наперадзе адкрываецца зусім новая дарослае жыццё. Учарашнія дзяўчынкі-школьніцы ператвараюцца ў шыкоўных дзяўчат-выпускніц, імкнуцца выглядаць у гэты дзень па-асабліваму. Падрыхтоўчыя клопаты да выпускнога вечара пачынаюцца загадзя. Дзяўчаты старанна прадумваюць усё: сукенку, прычоску, абутак, аксэсуары.

***Мода для выпускных урачыстасцяў*** існуе ўжо досыць даўно. Безумоўна, у гэтым стылі, як і ў іншых, ёсць свае тэндэнцыі. Кожны год дызайнерскія калекцыі папаўняюцца навінкамі, каб выпускнікі выглядалі не толькі раскошна, але яшчэ і модна.

***Якога колеру купіць сукенку?*** Колер — гэта першае, што ўспрымаюць вочы чалавека. Да выбару колеру варта падысці сур'ёзна. Ён павінен падыходзіць да твару дзяўчыны, выйгрышна падкрэсліваць скуру і валасы. Колер павінен падабацца юнай выпускніцы, тады яна будзе адчуваць сябе ўпэўнена. І абавязкова трэба ведаць, якія адценні ў трэндзе ў гэтым сезоне.

***На сённяшні дзень модная палітра:***

- ✓ адценні сіняга і блакітнага;
- ✓ аквамарын;
- ✓ бірузовы;
- ✓ адценні чырвонага;
- ✓ бардовы;
- ✓ персікавы;
- ✓ далікатна-ружовы;
- ✓ каралавы;
- ✓ сапфіравы;
- ✓ ізумрудны.

І, вядома ж, ***класічныя белы і чорны***. З апошнімі колерамі трэба быць асцярожнымі, каб не стаць падобнай на нявесту, або не зрабіць ўражанне дамы ў жалобе. Тым не менш, гэтыя колеры з'яўляюцца традыцыйнымі і штогод зноў і зноў з'яўляюцца на подыумах ў варыяцыі вячэрніх сукенак для выпускных вечароў. ***Галоўнае правіла ўсё ж такі не ў выбары моднага колеру, а ў стварэнні гарманічнага вобразу.*** Колер сукенкі павінен адпавядаць крою, сілуэту і тканіне.



*Старонку падрыхтавала*
*Вольга Жук*

# *Дом, у якім утульна ўсім!*








ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц. Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына, Сямашка Паліна